*Литература:*

1. Ожегов, С.И., Толковый словарь русского языка / С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова. – М., 2010. – Режим доступа: http://ozhegov.textologia.ru/
2. Толковый словарь русского языка: В 3 т./ Ред. Д. Н. Ушаков. – Изд. изм. и испр. Т. 1: А–М – М.: Вече: Мир книги, 2001. – 703 с.

УДК 378.147

*Ляскевіч Святлана Георгіеўна*[1]*, Ляскевіч Казімір Люцыянавіч*[2]

# СУЧАСНЫЯ МАДЭЛІ ЗМЕШАНАГА НАВУЧАННЯ ЯК АДКАЗ НА НОВЫЯ ЗАПЫТЫ ГРАМАДСТВА

*УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы»*
*Кафедра замежных моў*[1]
*УА «Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»*
*Кафедра ваеннай и экстрэмальнай медыціны*[2]

Чалавечае грамадства дзякуючы тэхналагічнаму прагрэсу з кожным дзесяцігоддзем развіваецца ўсё больш імкліва. Наша сённяшняе жыццё кардынальна адрозніваецца ад размеранага і, як бачыцца зараз, досыць стабільнага ўкладу сярэдзіны і нават канца XX стагоддзя. Абсалютна відавочна, што мы жывём у эпоху інфармацыйнага буму, хуткай змены парадыгмаў, скрайняга дынамізму. Кожны новы дзень ставіць новыя пытанні і вымагае імгненнага пошуку адказаў на іх, эфектыўнасці ў прыняцці рашэнняў. Новы час патрабуе і новых падыходаў у навучанні.

Традыцыйная мадэль навучання ў вышэйшых навучальных установах і школах укладаецца ў схему «лекцыя ў класе ці аўдыторыі / тлумачэнне новага матэрыялу – практычныя заняткі / апытанне па тэме лекцыі і выкананне заданняў на замацаванне тэмы – дамашняя работа – лекцыя – практычныя заняткі – дамашняя работа – экзамен».

Інтэграцыя трацыцыйных формаў навучання з анлайн-навучаннем падаецца сёння перспектыўным напрамкам, паколькі, з аднаго боку, адпавядае запыту навучэнцаў на новае і перспектыўнае, іх цікававасці да камп’ютарных тэхналогій, і, з другога боку, прызвана максімальна адаптаваць студэнтаў да новых распрацовак і навучыць збалансавана і эфектыўна іх выкарыстоўваць.

Рэпазіторый ГрДМУ

З уваходам Рэспублікі Беларусь у Балонскі працэс для нашай сістэмы адукацыі актуальнымі з'уляюцца нарматыўныя дакументы, што рэгулююць развіццё Еўрапейскай адукацыйнай прасторы. У сувязі з гэтым нагадаем пра распрацаваныя пры Савеце Еўропы і Еўрапарламенце Рамачныя ўстаноўкі, якія вылучаюць восем груп ключавых кампетэнцый, неабходных для асабістай самарэалізацыі, сацыяльнай згуртаванасці і магчымасці працаўладкавання ў сучасным грамадстве, сярод якіх група камп'ютарных кампетэнцый займае адно з прыярытэтных месцаў.

Перавага аддаецца наступным кампетэнцыям:

1. Валоданне роднай мовай;
2. Камунікацыя на замежных мовах;
3. Камп'ютарная (інфармацыйная) пісьменнасць;
4. Матэматычная пісьменнасць і базавыя кампетэнцыі ў навуцы і тэхналогіі;
5. Засваенне навыкаў навучання;
6. Сацыяльныя і грамадзянскія кампетэнцыі;
7. Наватарства, ініцыятыўнасць і прадпрымальнасць;
8. Дасведчанасць і здольнасць выяўляць сябе ў культурнай сферы [1].

Развіццё камп'ютарнай пісьменнасці навучэнцаў немагчымае без наяўнасці дадзенай кампетэнцыі щ выкладчыкаў. Магчымасці, якія дае змешанае навучанне, працуюць на развіццё і ўдасканаленне камп'ютарнай пісьменнасці, а таксама спрыяюць стварэнню мабільнага інфармацыйнага асяроддзя ў адпаведнасці з зацверджанай Канцэпцыяй інфарматызацыі сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь на перыяд да 2020 г.

Невыпадкова ў шэрагу апошніх публікацый па педагогіцы інавацыйны патэнцыял будучай адукацыі звязваецца з тэрмінам “змешанае навучанне” (рус. смешанное обучение, англ. blended learning).

Навучанне, пры якім адбываецца чаргаванне аўдыторных заняткаў з онлайн-навучаннем, камбінацыя онлайн-навучання з магчымасцю перыядычных кансультацый (вочных і завочных) з выкладчыкам, прынята называць “змешаным” навучаннем.

Змешанае навучанне бачыцца таксама неад'емнай часткай навучання на працягу ўсяго жыцця, адукацыі дарослых, альтэрнатыўнай адукацыі. І безумоўна, гэта найбольш дзейсны сродак навучання маладога пакалення, якое натуральна пачувае сябе ў



Репозиторий ГрГМУ

інфармацыйнай прасторы, у Інтэрнэт-павуціне. Эфектыўна гаварыць і вучыць сённяшніх студэнтаў і школьнікаў, далучаць іх да традыцыйных чалавечых каштоўнасцяў можна толькі з улікам новых формаў і падыходаў. Як сказаў Дж.Дзью “мы пазбаўляем дзяцей будучыні, калі працягваем вучыць сёння так, як вучылі гэтаму ўчора”.

Вядучы спецыяліст ў галіне змешанага навучання ў нашай краіне Л.В. Луцэвіч разглядае ўкараненне мадэляў змешанага навучання ў інавацыйныя адукацыйныя практыкі ў якасці дыдактычнага трэнду новай парадыгмы адукацыі – Smart-адукацыі, у якой, акрамя таго, прафарыентацыйнаму кампаненту будзе належаць адна з ключавых пазіцый [Гл. падр. 2].

Сярод шляхоў рэалізацыі змешанага навучання спецыялісты вылучаюць *ратацыйную мадэль* (з так званымі анлайн-станцыямі і з лабараторнымі работамі). Мадэль з анлайн-станцыямі ўключае як мінімум адну “станцыю” для навучання ў рэжыме анлайн. Іншыя “станцыі” павінны ўключаць работу ў невялікіх групах, калектыўныя праекты, чаргаванне паміж вучнямі розных відаў дзейнасці. *Індывідуальная ратацыйная мадэль* таксама ўключае абавязковы анлайн этап, аднак пры дадзенай мадэлі кожны навучэнец мае свій індывідуальны графік праходжання прадмета і не абявязаны праходзіць усе традыцыйныя этапы работы з матэрыялам. *Flex-мадэль* патрабуе перадачы зместу курса ў анлайн-рэжыме і мінімалізацыі падтрымкі вучняў у вочным рэжыме праз работу ў малых групах, праектах, індывідуальных кансультацыях. Пажадана наяўнасць сертыфікаваных анлайн-кансультантаў для штодзённай кансультацыйнай падтрымцы. У рамках *Self-blend мадэлі* студэнты ў дадатак да традыцыйных курсаў вочнага рэжыму бяруць некалькі іншых анлайн-курсаў. Калі работа навучальнай установы ў межах кожнай дысцыпліны базуецца на чаргаванні вочных і дыстанцыйных заняткаў, прапорцыі паміж якімі вызначаюць студэнты, можна гаварыць аб *віртуальна прасунутай мадэлі* змешанага навучання.

Такія мадэлі змешанага навучання як “пераверунты клас”, “змена рабочых зон”, “асабісты выбар” ілюструюць зліццё класічнага (традыцыйнага) і інавацыйнага падыходаў, калі студэнт становіцца актыўным удзельнікам вучэбнай дзейнасці, а настаўнік ужо не займае дамінантнае становішча і выступае кіроўцам у працэсе навучання.



Рэпазіторый ГрДМУ

Такім чынам, новыя патрабаванні грамадства і рынку працы вымагаюць ад кожнага дасканалага валодання шырокім колам кампетэнцый, каб гнутка адаптавацца да зменлівага ўзаемазвязанага свету. Новыя патрабаванні выклікаюць і новыя падыходы да адукацыі, адным з якіх з'уляецца так званая змешаная форма навучання, прызваная зрабіць працэс навучання якасным і цікавым.


***Літаратура***

1. Мацкевіч, Т. Ключавыя кампетэнцыі як крытэры якасці навучання / Т.Мацкевіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://nastgaz.by/?p=29793. – Дата доступу: 10.06.2015.
2. Луцэвіч, Л.В. У трэндзе – змешанае навучанне / Л.В. Луцэвіч // Настаўніцкая газета [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.nastaunik.info/metoda/quality/9486Якасць адукацыі. – Дата доступу: 17.09.2016.



УДК 378.035.7.5



***Машеро Сергей Аркадьевич***


# ИСТОРИЯ РАЗВИТИЯ ВОИНСКИХ УСТАВОВ КАК «НАСТАВЛЕНИЙ ДЛЯ ОБУЧЕНИЯ РАТНОМУ ДЕЛУ»


*УО «Витебский государственный университет имени П.М.Машерова»*
*Военная кафедра*


Анализ истории организации и проведения мероприятий военной подготовки показывает, что с давних времен остаются актуальными вопросы: «Как учить?» и «Чему учить?». По аналогии напрашивается еще один злободневный вопрос: «Какие учебники при этом использовать?».

Военная история - великий учитель. На протяжении многих веков накопление боевого опыта происходило интуитивно, методом проб и ошибок. Неудачи всякий раз оплачивались кровью, и это заставляло военачальников задумываться над тем, каким образом избежать просчетов и так организовать бой, чтобы было меньше издержек и людских потерь. С течением времени апробированные в ходе многих боев тактические правила отражались в трактатах, уставах, наставлениях и соответственно приобретали

Репозиторий ГрГМУ